❋ Круглы стол **«Кнігі і людзі»**, прымеркаваны да 100-годдзя Сцяпана Александровіча, адбыўся **22 снежня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Сцяпан Хусейнавіч – ураджэнец татарскай сям'і з Капыля, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, настаўнік, таленавіты пісьменнік, літаратуразнаўца, краязнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар – адкрываў для беларусаў малавядомыя старонкі з гісторыі айчыннай літаратуры. Сцяпан Александровіч развіваў жанры пісьменніцкай біяграфіі, краязнаўчага і біяграфічнага нарыса. Асаблівую ўвагу аддаваў жыццю і дзейнасці Ф. Скарыны. Даследаваў гісторыю народніцкага часопіса «Гоман», газет «Наша доля», «Наша Ніва» і іншых.